# Бібліятэкі: пара трансфармацыі

У часе прэс-канферэнцыі "Аб развіцці бібліятэчнай справы ў Рэспубліцы Беларусь" намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Алесь Суша гаварыў, што ў сувязі са змяненнем інфапрацэсаў у грамадстве й бібліятэкі праходзяць складаны, але вельмі важны працэс трансфармацыі. У краіне дзейнічае звыш 7 тысяч бібліятэк. Напрыклад, на пачатак 2020 года ў сістэме Мінкультуры іх налічвалася 2524. Увогуле ж бібліятэчны фонд краіны ўключае каля 180 млн фізічных дакументаў, а фонд Нацыянальнай бібліятэкі — звыш 10 мільёнаў.

Адна з новых тэндэнцый у развіцці бібліятэчнай сістэмы — пераход у віртуальную прастору. На прыкладзе НББ Алесь Суша патлумачыў, што яе чытачы, як і раней, прыходзяць ва ўстанову. Аднак штогод расце й колькасць віртуальных наведванняў: іх ужо звыш 70 працэнтаў. "Акрамя таго, увесь свет мае магчымасць далучыцца да сабраных намі інфарэсурсаў, у сувязі з чым пашыраецца геаграфія: у ліку нашых карыстальнікаў жыхары Зімбабвэ, Куала-Лумпур, Танзаніі", — адзначыў Аляксандр Суша. Да таго ж у бібліятэцы значна развіўся спектр інфапаслуг і рэсурсаў, якія прадастаўляюцца беларускім чытачам. Адкрываюцца новыя рэсурсы ў анлайн-доступе, паляпшаецца сфера віртуальнага кансультавання. "Для любога ахвочага даступная асноўная навуковая перыёдыка, публікацыі, дысертацыі ды іншыя дакументы з усяго свету", — падкрэсліў Алесь Суша.

**Падрыхтаваў Іван Ждановіч**